http://edoc.bseu.by/

***А.У. Кімбар**, выкладчык*
*andrejkimbar@gmail.com*
*МДПК (Мінск)*

# ІСТЫТУТ МЯСЦОВАГА РЭФЕРЭНДУМУ Ў РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ

У адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь рэферэндум з’яўляецца спосабам прыняцця грамадзянамі Рэспублікі Беларусь рашэнняў па важнейшых пытаннях дзяржаўнага і грамадскага жыцця. У Рэспубліцы Беларусь могуць праводзіцца рэспубліканскія і мясцовыя рэферэндумы.

Рэспубліканскія рэферэндумы праводзіліся ў гісторыі суверэннай Беларусі тройчы: 14 мая 1995 г., 24 лістапада 1996 г. і 17 кастрычніка 2004 г. [1]. На іх разглядаліся актуальныя пытанні грамадска-палітычнага і сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны.

Цяпер сфарміраваная Канстытуцыйная камісія і вядзецца работа па стварэнні новага праекта Канстытуцыі, які будзе вынесены на рэспубліканскі рэферэндум. Перад рабочай групай стаіць задача адпрацаваць прынцыповыя пытанні, якія датычацца падрыхтоўкі канстытуцыйных змяненняў, галоўныя з якіх – замацаванне ролі Усебеларускага народнага сходу, пераразмеркаванне паўнамоцтваў паміж органамі дзяржаўнай улады, захаванне збалансаванасці дзяржаўнага апарату і інш. [2].

Мясцовыя рэферэндумы ў рэспубліцы не праводзіліся, хаця мясцовы рэферэндум забяспечвае найбольш поўны ўдзел грамадзян у вырашэнні пытанняў на месцах, грае важную ролю ў развіцці ініцыятывы грамадзян і з'яўляецца эфектыўным сродкам выяўлення народам сваіх інтарэсаў.

Мэтай дадзенай работы з’яўляецца алаліз механізму правядзення мясцовага рэферэндуму ў Рэспубліцы Беларусь.

У Рэспубліцы Беларусь на мясцовы рэферэндум могуць выносіцца пытанні, якія маюць вельмі важнае значэнне для насельніцтва адпаведных адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак і аднесены да кампетэнцыі адпаведных мясцовых Саветаў дэпутатаў, выканаўчых і распарадчых органаў.

Права ініцыятывы на правядзенне мясцовага рэферэндуму належыць мясцовым прадстаўнічым органам і грамадзянам Рэспублікі Беларусь, якія пастаянна пражываюць на тэрыторыі адпаведнай вобласці, раёна, горада, раёна ў горадзе, пасёлка, сельсавета. Ініцыятыва грамадзян выказваецца ў выглядзе прапановы, унесенай не менш чым 10 працэнтамі грамадзян, якія валодаюць выбарчым правам і пражываюць на адпаведнай тэрыторыі.

Калі грамадзяне выступаюць з ініцыятывай аб правядзенні мясцовага рэферэндуму, імі ўтвараецца ініцыятыўная група з ліку асоб, якія маюць права ўдзельнічаць у рэферэндуме, у колькасці: у вобласці і горадзе Мінску – не менш 50 чалавек; у раёне, горадзе, раёне ў горадзе – не менш 20 чалавек; у пасёлку, сельсавеце – не менш 10 чалавек.

Дакументы аб правядзенні мясцовага рэферэндуму, прадстаўленыя ініцыятыўнай групай, і пытанне, што прапануецца на рэферэндум, накіроўваюцца мясцовым выканаўчым і распарадчым органам на заключэнне ў адпаведны абласны, Мінскі гарадскі орган юстыцыі, якія правяраюць адпаведнасць пытання, што выносіцца на рэферэндум, патрабаванням заканадаўства і захаванне парадку ўтварэння ініцыятыўнай групы.

Пытанне, што прапануецца на мясцовы рэферэндум, з улікам заключэння адпаведнага абласнога, Мінскага гарадскога органа юстыцыі, і склад ініцыятыўнай групы рэгіструюцца адпаведным мясцовым выканаўчым і распарадчым органам [3].

Асобнай увагі заслугоўвае працэс фінансавання правядзення мясцовага рэферэндуму.

Фінансаванне расходаў, звязаных са зборам подпісаў грамадзян у падтрымку прапановы аб рэферэндуму і правядзеннем агітацыі па ініцыяванню рэферэндуму грамадзянамі, ажыццяўляецца за кошт сродкаў фонду ініцыятыўнай групы.

Фонд ініцыятыўнай групы па правядзенні абласнога, Мінскага гарадскога, раённага, гарадскога (у горадзе абласнога падпарадкавання) рэферэндуму можа фарміравацца за кошт добраахвотных ахвяраванняў членаў ініцыятыўнай групы, іншых грамадзян і добраахвотных ахвяраванняў юрыдычных асоб. Прычым усталяваныя абмежаванні: гранічная сума ўсіх выдаткаў са сродкаў фонду ініцыятыўнай групы па правядзенні абласнога, Мінскага гарадскога рэферэндуму не можа перавышаць 500 базавых велічынь, а па правядзенні раённага, гарадскога (у горадзе абласнога падпарадкавання) рэферэндуму – 100 базавых велічынь. Гранічная сума ўсіх выдаткаў са сродкаў фонду ініцыятыўнай групы па правядзенні гарадскога (у горадзе раённага падпарадкавання), пасялковага, сельскага рэферэндуму не можа перавышаць 50 базавых велічынь [3].

Некаторыя з даследчыкаў лічаць, што існаванне фінансавага чынніку з'яўляецца адной з прычын таго, што мясцовыя рэферэндумы яшчэ не праводзіліся ў Беларусі [4; 5].

У апошнія гады праблематыка правядзення мясцовых рэферэндумаў неаднаразова абмяркоўвалася даследчыкамі і дзяржаўнымі дзеячамі краіны. Так, у 2019 г. загадчык кафедры канстытуцыйнага права юрыдычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, доктар юрыдычных навук, прафесар Р. А. Васілевіч адзначыў, што «ў Беларусі было б карысна праводзіць мясцовыя рэферэндумы па актуальных пытаннях. За ўсю савецкую і сучасную гісторыю, нягледзячы на наяўнасць для гэтай заканадаўчай асновы, яны так і не праводзіліся». Па яго меркаванні, варта ўзмацніць уплыў мясцовых прадстаўнічых органаў – мясцовых Саветаў дэпутатаў, іх фінансава-эканамічнай базы [6].

У ліпені 2020 г. падчас сустрэчы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А.Р. Лукашэнкі з жыхарамі Брэста было закранута пытанне аб правядзенні мясцовага рэферэндуму па пытанні будаўніцтва і ўводу ў дзеянне

акумулятарнага завода. Прэзідэнт прапанаваў правесці мясцовы рэферэндум пасля правядзення прэзідэнцкіх выбараў 2020 г. [7].

У кастрычніку 2020 г. у Брэсцкім абласным выканаўчым камітэце прайшла сустрэча з прадстаўнікамі грамадскай групы па пытаннях будаўніцтва акумулятарнага завода. Пытанне з рэферэндумам засталося адкрытым. Намеснік старшыні аблвыканкама Г. І. Барысюк адзначыў: «Для таго, каб выканаць даручэнне Прэзідэнта, патрэбныя канкрэтныя крокі. Так, ёсць пытанні – тэхнічнага характару, іншыя, – але трэба ісці насустрач адзін аднаму, рэальнымі справамі вырашаць гэтую праблему» [8].

Такім чынам, вынікі даследавання паказваюць, што ў Рэспубліцы Беларусь існуе заканадаўчая аснова для правядзення мясцовых рэферэндумаў, але на практыцы яны не праводзіліся. Даследчыкі і дзяржаўныя дзеячы адзначаюць неабходнасць правядзення такіх рэферэндумаў для найбольш поўнага ўдзелу грамадзян у вырашэнні пытанняў на месцах.

**Спіс крыніц:**

1. Центральная комиссия Республики Беларусь по выборам и проведению республиканских референдумов [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://rec.gov.by/ru/archiv-referendumy-ru/. – Дата доступа: 11.11.2021.
2. Встреча с рабочей группой по доработке проекта Конституции [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://president.gov.by/ru/events/vstre-cha-s-rabochey-gruppoy-po-dorabotke-proekta-konstitucii – Дата доступа: 14.11.2021.
3. Избирательный кодекс Республики Беларусь [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://pravo.by/document/?guid=3871&p0=hk0000370. – Дата доступа: 14.11.2021.
4. Бич, Н. В. Местные референдумы в Республике Беларусь: проблемы и перспективы развития / Н. В. Бич. // Правовое обеспечение инновационного развития общества и государства: материалы междунар. науч. конф. студентов, магистрантов и аспирантов. Минск, 29–30 окт. 2010 г. – Минск, 2011. – С. 62–63.
5. Дулуб, А. В. Местный референдум как форма непосредственной демократии в Республике Беларусь / А. В. Дулуб, И. О. Силков // Белорусское право во времени и пространстве : сборник тезисов докладов Республиканской научно-теоретической конференции студентов, магистрантов, аспирантов, Минск, 4 декабря 2019 года / [под ред. И.П. Манкевич] ; УО «Белорусский государственный экономический университет». – Минск, 2020. – С. 181–182.
6. Василевич предлагает апробировать в Беларуси практику проведения местных референдумов [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://www.belta.by/politics/view/vasilevich-predlagaet-aprobirovat-v-belarusi-prak-tiku-provedenija-mestnyh-referendumov-340066-2019/. – Дата доступа: 13.11.2021.
7. Лукашенко пообещал объявить в Бресте референдум по поводу судьбы аккумуляторного завода [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://www.belta.by/president/view/lukashenko-poobeschal-objjavit-v-breste-refe-rendum-po-povodu-sudby-akkumuljatornogo-zavoda-395756-2020/. – Дата доступа: 13.11.2021.